Источник: “Наша слова” – 2014-05-21

# Памяці навукоўца

Выдавецтва Інбелкульт (Смаленск) парадавала навуковую грамадскасць зборнікам "Да сваёй гісторыі: Сярэднявечча і Ранні Новы час". 2013 год. У зборніку змешчаныя артыкулы, у якіх разглядаюцца розныя аспекты айчыннай і сусветнай гісторыі эпохі Сярэднявечча і Ранняга Новага часу. Асабліва ўвага нададзена дыскусійным і маладаследаваным аспектам развіцця беларускіх зямель у першыя дзеся-цігоддзі існавання Рэчы Паспалітай. Зборнік прысвечаны памяці вядомага беларускага гісторыка Паўла Лойкі (1958-2010 гг.), ён быў аўтарам шматлікіх навуковых публікацый. Некалькіх школьных падручнікаў і дапаможнікаў, частым госцем на тэлебачанні і радыё, адной з самых яскравых поста-цей у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук Беларусі, вельмі папулярным выкладчыкам гістарычнага факультэта БДУ. Павел Алегавіч пакінуў шматлікіх вучняў, і яшчэ больш людзей сталі, дзякуючы яму, аматарамі беларускай гісторыі.

Як можна зразумець па гэтым зборніку, спадар Лойка займеў тут немалую колькасць паслядоўнікаў і калег па даследчыцкай праблематыцы.

Са сваімі артыкуламі ў зборніку выказаліся: Іна Соркіна, Алена Дзянісава, Наталля Сліж, Настасся Скеп'ян, Макар Шніп, Маргарыта Фабрыкант, Уладзімір Падалінскі, Андрэй Мацук, Сцяпан Цемушаў. Мяне асабіста вельмі зацікавіў тэкст дацэнта кафедры грамадскіх навук Гарадзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, кандыдата гістарычных навук Віталя Галубовіча. Які мае назву "Лісты Уладзіслава IV Вазы да падскарбія ВКЛ Мікалая Кішкі са збораў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі". Зборнік разлічаны для гісторыкаў і аматараў беларускай мінуўшчыны.

Рэцэнзентамі кнігі з'яўляюцца доктар гістарычных навук Ю.І. Бохан і кандыдат гістарычных навук А.І. Груша.

Гэты зборнік з накладам 100 асобнікаў - даніна вялікай павагі і памяці, якую аддае цэлае пакаленне беларускіх гісторыкаў чалавеку, чыё імя застанецца адным з самых важных ў айчыннай гістарыяграфіі канца XX - пачатку XXI стагоддзяў. Кніга каштуе 144000 рублёў.